**Библиографический список**

1. Литовский государственный исторический архив (ЛГИА). Ф. 570. Оп. 1. Д. 101.
2. Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). Ф. 2254. Оп. 2. Д. 643.
3. Отчет о состоянии учебных заведений и учреждений Виленского учебного округа за 1910 год. Вильна: тип. А. Г. Сыркина, 1911.
4. ЛГИА. Ф. 567. Оп. 12. Д. 1713.
5. ЛГИА. Ф. 567. Оп. 12. Д. 1733.
6. Отчет о состоянии Слуцкой гимназии в 1898–1899 учебном году / сост. В. Я. Седов. Слуцк: тип. Я. Х. Яброва, 1900.
7. ЛГИА. Ф. 567. Оп. 14. Д. 930.
8. Федорин С. В. Государственная система физического воспитания в русской армии и на флоте (вторая половина XIX в. – 1914 г.). СПб.: ВИТУ, 2002.

# «ТАК ПОДАТЬ ЛЕКЦИЮ ПО АРХЕОЛОГИИ БЕЛОРУССИИ НЕ МОЖЕТ НИКТО»: ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА А. Г. МІТРАФАНАВА

***А. У. Вайтовіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле прапануецца рэканструкцыя асноўных вехаў выкладчыцкай дзейнасці вядомага беларускага археолага Аляксея Рыгоравіча Мітрафанава. Разгледжаны тры накірункі працы даследчыка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце: чытанне курса па асновах археалогіі, правядзенне выязных археалагічных практык, арганізацыя археалагічнага аддзелу ўніверсітэцкага гістарычнага музея.

***Ключавыя словы:*** археалогія; адукацыя; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

# «ТАК ПОДАТЬ ЛЕКЦИЮ ПО АРХЕОЛОГИИ БЕЛОРУССИИ НЕ МОЖЕТ НИКТО»: ШТРИХИ К ПОРТРЕТУ А. Е. МИТРОФАНАВА

***А. В. Вайтович***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

В статье предлагается реконструкция основных вех преподавательской деятельности известного белорусского археолога А. Е. Митрофанова. Рассмотрены три направления деятельности исследователя в Белорусском государственном университете: чтение курса по основам археологии, проведение полевых археологических практик, организация археологического отдела исторического музея университета.

***Ключевые слова:*** археология; образование; Белорусский государственный университет.

# «NO ONE CAN LECTURE ON THE ARCHAEOLOGY OF BELARUS IN THIS WAY»: TOUCHES TO THE PORTRAIT OF ALIAKSEY MITRAFANAU

***A. U. Vaitovich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus*

Article devotes to the reconstruction of the main landmarks of the teaching activity of the famous Belarusian archaeologist Aliaksey Mitrafanau. Three key topics are discussed. A. Mitrafanau lectured courses on the archaeology of Belarus for the students of the Belarusian State University. He organized field archaeological training. Moreover, he took part in the organization of the archaeological department of the university historical museum.

***Keywords:*** archaeology; education; Belarusian State University.

У назву артыкула вынесены словы, якімі ў 1980 г. вядомы беларускі даследчык Э. М. Загарульскі ахарактарызаваў выкладчыцкае майстэрства свайго калегі, выбітнага археолага А. Р. Мітрафанава [1, арк. 25–26]. У 2022 г. спаўняецца 110 год з дня нараджэння Аляксея Рыгоравіча (1912–1988). Чарговая юбілейная дата натхняе на асэнсаванне жыццёвага шляху і творчай спадчыны навукоўца. Сёння назапашана даволі прадстаўнічая бібліяграфія, прысвечаная разгляду лёсу і навуковага даробку А. Р. Мітрафанава (гл., напр: [2–4; 5, с. 187; 6, с. 255–256]). Найменш даследаванай старонкай біяграфіі адмыслоўца дагэтуль застаецца яго праца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (далей – БДУ). Агульнапрызнана, што А. Р. Мітрафанаў аказаў значны ўплыў на выхаванне некалькіх пакаленняў беларускіх археолагаў [4, с. 92; 5, с. 176]. Канкрэтызацыя гэтай тэзы, аднак, у літаратуры адсутнічае.

Мэтай прапанавага артыкула з’яўляецца рэканструкцыя асноўных вехаў выкладчыцкай дзейнасці вядомага навукоўца. Пры падрыхтоўцы публікацыі выкарыстаны матэрыялы, якія захоўваюцца ў фондах аддзела архіўнай працы, уліку і выкарыстання дакументаў БДУ [7], Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ) [1, 8–20], а таксама ў Архіве археалагічнай навуковай дакументацыі ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі» (далей – ААНД ІГ НАНБ) [21].

А. Р. Мітрафанаў нарадзіўся ў вёсцы Асташкава (сучасная Цвярская вобласць Расійскай Федэрацыі) ў сялянскай сям’і. У 1936 г. ён скончыў Ленінградскі дзяржаўны інстытут гісторыі, філасофіі і лінгвістыкі, пазней рэарганізаваны ў гістарычны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – ЛДУ), і атрымаў кваліфікацыю навуковага супрацоўніка па гісторыі дакласавага грамадства [7, арк. 12]. На працягу некалькіх наступных год Аляксей Рыгоравіч настаўнічаў у горадзе на Няве.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны ён быў прызваны на фронт і толькі ў 1946 г. змог нарэшце завяршыць службу ў Чырвонай Арміі.

Пасля дэмабілізацыі А. Р. Мітрафанаў вярнуўся ў сваю альма-матар і ўладкаваўся лабарантам кафедры археалогіі. У хуткім часе ён перайшоў на пасаду малодшага навуковага супрацоўніка Гістарычнага навукова-даследчага інстытута, створанага пры ЛДУ [7, арк. 10зв.]. У 1949 г. інстытут быў зачынены. Разгаралася сумнавядмая «Ленінградская справа» [22, с. 294–295], і пачынаючы даследчык палічыў за лепшае прыняць запрашэнне К. М. Палікарповіча [23, с. 133] і пераехаць у Мінск. У маі 1950 г. Аляксей Рыгоравіч прыступіў да выканання абавязкаў малодшага навуковага супрацоўніка сектара археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР [7, арк. 8зв., 10зв.]. Яго навуковыя інтарэсы сканцэнтраваліся на вывучэнні помнікаў жалезнага веку Цэнтральнай Беларусі.

Прыезд ленінградскага навукоўца ў Беларусь прыйшоўся на часы пасляваеннага аднаўлення рэспублікі. У гэты няпросты перыяд ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры адчуваўся востры недахоп кваліфікаваных спецыялістаў. Гістарычная адукацыя, франтавыя заслугі, досвед выкладчыцкай і даследчай дзейнасці адчынялі перад А. Р. Мітрафанавым дзверы галоўнай адукацыйнай пляцоўкі краіны – Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У верасні 1950 г. Аляксей Рыгоравіч запоўніў асабісты лісток па ўліку кадраў БДУ. Ён быў прыняты на пасаду старшага выкладчыка завочнага факультэта [7, арк. 24]. Праца А. Р. Мітрафанава на завочным факультэце БДУ цягнулася шэсць год. Звесткі аб тым, якія курсы чытаў археолаг студэнтам-завочнікам, не былі выяўлены.

Адначасова Аляксей Рыгоравіч пачаў супрацоўніцтва з кафедрай гісторыі старажытнага свету (з 1955 г. – кафедрай гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў) гістарычнага факультэта. Менавіта гэтая кафедра, якую ўзначальваў прафесар М. М. Нікольскі, у канцы 1940-х– пачатку 1950-х гг. забяспечвала выкладанне археалогіі і сумежных дысцыплін. На працягу першага пасляваеннага дзесяцігоддзя для чытання агульнага курса па асновах археалогіі нязменна запрашаўся старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР В. Р. Тарасенка [24]. У 1950/1951 вучэбным годзе А. Р. Мітрафанаву быў даручаны толькі спецыяльны курс «Матэрыяльная культура Усходняй Еўропы ў дафеадальны перыяд» на ўмовах пагадзіннай аплаты [7, арк. 7].

Універсітэцкія інтэлектуалы добра разумелі, што належная падрыхтоўка прафесійных гісторыкаў павінна ўключаць не толькі

атрыманне тэарэтычных ведаў, але і набыццё практычных навыкаў. У сакавіку 1951 г. на пасяджэнні кафедры гісторыі старажытнага свету было вырашана «производственную практику проводить на местах раскопок древнейших государств» [8, арк. 35]. Слабасць матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта, аднак, не спрыяла хуткаму выкананню заяўленых планаў. Толькі летам 1954 г. з'явіліся магчымасці правесці археалагічныя даследаванні. Першую пасляваенную археалагічную экспедыцыю БДУ ўзначаліў А. Р. Мітрафанаў.

Будучым гісторыкам давялося паўдзельнічаць у раскопках гарадзішча на Менцы – паселішча, якое яшчэ ў 1930-я гг. было названа «першапачатковым Менскам» [25]. Практыканты аднесліся да сваіх абавязкаў з цікавасцю і адказнасцю. «Студэнты Вайтовіч і Мельнік знайшлі лепную кераміку, якая адносіцца да VI–VII вякоў да новай эры. Студэнт Скарабагаты раскапаў шмат керамічных вырабаў вялікакняжскай пары. Першы на тэрыторыі Беларусі жалезны сашнік, які па меркаваннях вучоных адносіцца да X–XI стагоддзяў нашай эры, знайшоў студэнт Камароў» – так універсітэцкая шматтыражка падводзіла вынікі практыкі [26]. Кіраўніцтва факультэта з задавальненнем адзначала ў гадавой справаздачы: «Работа на раскопках принесла большую пользу студентам с точки зрения закрепления знаний по истории СССР древнего периода и приобретения навыков археологической работы» [9, арк. 80–81].

Восенню 1954 г. выкладчыцкая нагрузка А. Р. Мітрафанава павялічылася. Аляксею Рыгоравічу перадалі курс «Асновы археалогіі», якія раней вёў В. Р. Тарасенка [7, арк. 15]. У НАРБ захаваўся практакол абмеркавання супрацоўнікамі кафедры гісторыі старажытнага свету БДУ адной з лекцый, прачытаных навукоўцам у лістападзе 1954 г. Для адкрытага занятку А. Р. Мітрафанаў выбраў найбольш блізкую сваім прафесійным інтарэсам тэму – пачатак ранняга жалезнага веку. Прафесар Ф. М. Нечай, які на той час узначальваў кафедру, выступіў з крытычнай, але дабразычлівай прамовай: «А. Г. Митрофанов не дал плана лекции. Это ее существенный недостаток. Говоря о значении металлургии железа… необходимо было изложить это словами Энгельса и подчеркнуть роль железа в процессе перехода от первобытного общества к классовому. Недостатком лекции является и то, что в ней не дано конкретных памятников, в которых были обнаружены первые изделия из железа. Лекция была мало иллюстрирована. Положительной стороной лекции А. Г. Митрофанова следует признать следующее: в ней с исчерпывающей полнотой (лучше, чем в учебнике) освещены вопросы технологии железа,

раскрыты древние способы добычи и обработки этого металла. В целом лекция оставила благоприятное впечатление. А. Г. Митрофанов обнаружил хорошее знание предмета и прочел лекцию на должном научном и методическом уровне» [10, арк. 47–48].

Падрыхтоўка да заняткаў не перашкаджала актыўнай навуковай дзейнасці. У чэрвені 1955 г. дасведчаны даследчык абараніў кандыдацкую дысертацыю ў ЛДУ [7, арк. 11]. Праз месяц ён выправіўся ў чарговую экспедыцыю і зноў узначаліў археалагічную практыку. Згодна з універсітэцкімі дакументамі, студэнты спасцігалі азы палявой археалогіі ў Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці [11, арк. 26]. Гэтыя звесткі, аднак, варта лічыць недакладнымі. Са справаздач А. Р. Мітрафанава вынікае, што ў 1955 г. даследаванні вяліся на тэрыторыі іншых раёнаў вобласці – Вілейскага і Маладзечанскага [27; 28].

Восенню 1955 г. дзейнасць А. Р. Мітрафанава на гістарычным факультэце БДУ абмежавалася вядзеннем курса па асновах археалогіі [12, арк. 20]. Студзень 1956 г. прынес аўтарытэтнаму навукоўцу доўгачаканае прысуджэнне ступені кандыдата гістарычных навук [7, арк. 11]. Перад Аляксеем Рыгоравічам адкрываліся новыя перспектывы кар'ернага росту. У кастрычніку 1956 г. А. Р. Мітрафанаў, ужо навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР, быў прыняты на пасаду дацэнта кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў БДУ па сумяшчальніцтву [7, арк. 18]. На працягу чатырох год ён чытаў курсы па асновах археалогіі, гісторыі першабытнага грамадства і этнаграфіі [16, арк. 174, 192; 18, арк. 14, 20, 33, 42; 13, арк. 92].

Апантаны даследчык, А. Р. Мітрафанаў не заставаўся ў баку ад факультэцкага навуковага жыцця. У 1957–1958 гг. на пасяджэннях кафедры абмяркоўваліся перспектывы падрыхтоўкі і публікацыі цэлага шэрага рукапісаў Аляксея Рыгоравіча: «Поселения раннего железного века севера БССР» [18, арк. 10], «Археологические исследования БССР за сорок лет» [16, арк. 201–202; 18, арк. 25], «Поселения средней Белоруссии в эпоху раннего железа» [18, арк. 26]. Напрацоўкі 1950-х гг. ляглі ў аснову тэкстаў, апублікаваных у наступныя годы.

Усё больш уцягваючыся ва ўніверсітэцкія справы, акадэмічны навуковец непазбежна мусіў улічваць у сваёй дзейнасці шматлікія інструкцыі і распараджэнні міністэрства вышэйшай адукацыі. У БДУ другая палова 1950-х гг. прайшла пад лозунгамі ўзмацнення практычнага складніку навучальнага працэсу і паляпшэння самастойнай працы студэнтаў [17, арк. 39–40]. Новыя вучэбныя планы, да выканання якіх

далучыўся Аляксей Рыгоравіч, прадугледжвалі правядзенне двухтыднёвай археалагічнай практыкі [17, арк. 47, 49, 54].

Летам 1957 г. трэццякурснікі гістарычнага факультэта прынялі ўдзел у раскопках гарадзішча жалезнага веку каля вёскі Малышкі пад Маладзечнам [17, арк. 55]. У канцы чэрвеня – пачатку ліпеня 1958 г. студэнты БДУ далучыліся да вывучэння гарадзішча каля вёскі Збаравічы Заслаўскага раёна. Як адзначалася ва ўніверсітэцкіх дакументах, «помимо важных научных результатов, раскопки дали студентам большие навыки самостоятельной работы» [17, арк. 83]. Сапраўды, Аляксей Рыгоравіч знаёміў студэнтаў з усімі відамі працы на раскопе, у тым ліку даручаў вядзенне палявой дакументацыі. Дзённікі, якія старанна вялі практыканты, сёння можна знайсці ў ААНД ІГ НАНБ [21] і ўбачыць ў экспазіцыйнай зале пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

У другой палове 1950-х гг. набыў актуальнасць яшчэ адзін важны накірунак працы. Кіраўніцтва ўніверсітэта, імкнучыся пераўтварыць у жыццё міністэрскія загады па ўдасканаленні самастойнай вучэбнай дзейнасці студэнтаў, паставіла перад супрацоўнікамі гістарычнага факультэта задачу разгарнуць экспазіцыю гістарычнага музея [17, арк. 41–42]. У 1957/1958 вучэбным годзе А. Р. Мітрафанаў разам з калегамі з кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў займаўся зборам і сістэматызацыяй матэрыялаў па старажытнай гісторыі [17, арк. 90; 18, арк. 11]. У 1959 г. кафедра гісторыі БССР, на чале якой стаяў Л. С. Абэцэдарскі, прыступіла да арганізацыі археалагічнага і этнаграфічнага аддзелаў музея [14, арк. 5]. А. Р. Мітрафанаў прыняў актыўны ўдзел у адборы экспанатаў (малюнак). Асноўная праца была завершана ў 1960 г. [14, арк. 5; 98].

У тым жа годзе спынілася і супрацоўніцтва Аляксея Рыгоравіча з БДУ: згодна з чарговым урадавым пастанаўленнем, сумяшчальніцтва па службе павінна было быць абмежаванае [15, арк. 86]. Курс «Асновы археалогіі» перайшоў да маладога выкладчыка Э. М. Загарульскага, які працаваў на кафедры гісторыі БССР на пагадзіннай аснове [20, арк. 97].

Развітанне з універсітэтам, аднак, не было канчатковым. У 1964 г. дасведчанага археолага запрасілі прачытаць курс па гісторыі Старажытнай Грэцыі [7, арк. 4, 5]. Апошні этап працы А. Р. Мітрафанава са студэнцкай моладдзю прыйшоўся на канец 1970-х гг., калі на гістарычным факультэце ўжо дзейнічала кафедра археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. Аляксей Рыгоравіч выкладаў будучым археолагам і этнографам спецыяльны курс па археалогіі Беларусі [19, арк. 27; 1, арк. 25–26]. У

сакавіку 1980 г. Э. М. Загарульскі, тады загадчык кафедры, падзяліўся з калегамі сваімі ўражаннямі ад наведвання заняткаў легенды беларускай археалогіі: «Хорошей методикой чтения лекции он всегда владел, подавал лекции в проблемном плане, показывая знание материала. Но А. Г. Митрофанов – большой либерал со студентами. Надо быть построже» [1, арк. 25–26].



Рыс. 1. Адбор экспанатаў для Музея археалогіі і этнаграфіі. 1959 г.
На фота (злева направа): Л. С. Абэцэдарскі, А. П. Ігнаценка, А. Р. Мітрафанаў, А. І. Сідарэнка, М. П. Баранава. Паводле: [29].

Можна меркаваць, што менавіта такі вобраз адмыслоўца – выдатны аратар, які не загрувашчвае сваю лекцыю шматлікімі датамі і фактамі, але адкрывае перад слухачамі таямнічы свет археалогіі, – і застаўся ў памяці многіх пакаленняў выпускнікоў гістарычнага факультэта БДУ.

**Бібліяграфічны спіс**

1. НАРБ. Ф. 205. В. 8. Спр. 2067.
2. Шадыро В. И. Памяти Алексея Григорьевича Митрофанова // Советская археология. 1989. № 2. С. 296–297.
3. Шадыро В. И. Железный век Северной Белоруссии в исследованиях А. Г. Митрофанова // Насельніцтва Беларусі і сумежных тэрыторый у эпоху жалеза / Тэз. дакладаў канф., прысвечанай 80-годдзю з дня нараджэння А. Р. Мітрафанава (10–12 снежня 1992 г.). Мінск, 1992. С.112–115.
4. Шадыро В. И. К 100-летию со дня рождения А. Г. Митрофанова // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сер. 3. 2013. № 3. С. 90–92.
5. Алексеев Л. В. Археология средневекового периода в Белоруссии (1950–1990 гг.) // Советская археология. 1998. № 3. С. 176–190.

6. Віцязь С. П., Мядзведзева В. У., Дучыц Л. У. Даследчыкі археалагічных старажытнасцей Беларусі: біябібліяграфічны даведнік. Мінск: Беларуская навука, 2020. 504 с.
7. Аддзел архіўнай працы, уліку і выкарыстанння дакументаў БДУ. Ф. 205. Воп. 36. Спр. 834. (А. Г. Митрофанов).
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 205. В. 5. Спр. 245.
9. НАРБ. Ф. 205. В. 5. Спр. 389.
10. НАРБ. Ф. 205. В. 5. Спр. 426.
11. НАРБ. Ф. 205. В. 5. Спр. 434.
12. НАРБ. Ф. 205. В. 5. Спр. 503.
13. НАРБ. Ф. 205. В. 5. Спр. 682.
14. НАРБ. Ф. 205. В. 5. Спр. 734.
15. НАРБ. Ф. 205. В. 5. Спр. 807.
16. НАРБ, Ф. 205. В. 5. Спр. 1305.
17. НАРБ. Ф. 205. В. 5. Спр. 1317.
18. НАРБ. Ф. 205. В. 6. Спр. 152.
19. НАРБ. Ф. 205. В. 8. Спр. 1901.
20. НАРБ. Ф. 205. В. 10. Спр. 943.
21. Архіў археалагічнай навуковай дакументацыі ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі» (ААНД ІГ НАНБ). Арх. № 87а.
22. Носов Е. Н., Тихонов И. Л. Кафедра археологии // Исторический факультет СПбГУ: 1934–2004: Очерки истории / Отв. ред. А. Ю. Дворниченко. СПб., 2004. С. 278–316.
23. Чубур А. А. Очарованный древностью. Константин Михайлович Поликарпович: жизнь, открытия, ученики. Брянск: «Карат», 2006. 288 с.
24. Вайтович А. В. «Советские ученые были на своем посту»: изучение и преподавание археологии и истории первобытного общества в БГУ в военные и первые послевоенные годы // Журнал Белорусского государственного университета. История. 2021. № 4. С. 80–90.
25. Звязда. 1935. 27 мая. № 119. С. 4.
26. За сталінскія кадры. 1954. 1 верасня. № 15. С. 3.
27. ААНД ІГ НАНБ. Арх. № 84.
28. ААНД ІГ НАНБ Арх. № 93а (93).
29. Беларускі ўніверсітэт. 1959. 28 сакавіка. № 13. С. 2.

# БЕЛОРУССКАЯ СОВЕТСКАЯ МЕДИЕВИСТИКА: ОПОРНАЯ СТРУКТУРА И ИДЕОЛОГИЧЕСКАЯ РАМКА

***И. О. Евтухов***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, Ewtuhow@tut.by*

Белорусская советская медиевистика сформировалась и развивалась как часть советской медиевистики. Путь развития был схож по форме и содержанию. В то же время белорусская советская медиевистика имела ряд характерных только для нее особенностей. Во-первых, не было специального центра по изучению западноевропейского средневековья (как сектор истории средних веков (с 1936 года) и сектор истории Византии (с 1955 года) Института истории АН СССР) и специальных научных журналов. Во-вторых, белорусские историки не оставили заметного следа в дискуссиях советских медиевистов (генезис феодализма, средневековый город, абсолютизм). В-третьих, развитие темы, которая была проигнорирована советскими